ДЗЕЦІ ВАЙНЫ

Фелікс БАТОРЫН

# ЧОРНЫ ГОД

Мастацка-дакументальная
аповесць

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2011

УДК 821.161.1(476)–1
ББК 84(4Беи=Рус)–5
Б 28

Серыя заснавана ў 2010 г.

*Аўтар выказвае шчырую падзяку
Аб'яднанню беларускіх яўрэйскіх грамадскіх
арганізацый і абшчынаў і яго старшыні сп. Л. Левіну,
дырэктару Музея гісторыі і культуры
яўрэяў Беларусі сп-не І. Герасімавай,
а таксама сп. Л. Слабодскаму, Л. Клябанавай,
Е. Трыбельскай, М. Нардштэйну, Я. і Р. Мазо, Я. Гутману,
М. Звяняцкаму, Р. Шварцман, І. Мішынёвай, Г. Давыдовіч,
Л. Пінхасіку, Б. і Д. Астроўскім,
жонцы Ганне і сыну Дзмітрыю за падтрымку гэтага выдання*

*Аўтар уступнага артыкула
канд. гіст. навук **І. П. Герасімава***

**Баторын, Ф. Б.**

Б 28 Чорны год: мастацка-дакументальная аповесць / Фелікс Баторын. – Мінск : Выдавецтва «Чатыры чвэрці», 2011. – 280 с., [2] л. іл. (Сер. «Дзеці вайны»).

ISBN 978-985-6981-17-6.

Аповесць «Чорны год» знаёміць чытача з рэальнымі падзеямі, але расказвае пра іх мастацкім словам, што робіць гэты твор даступным і тым людзям, якія не падрыхтаваны да ўспрымання сухой мовы дакумента. Падзеі, пра якія апавядае аўтар, сын аднаго з галоўных герояў аповесці, адбываліся ў чэрвені – снежні 1941 года ў Беларусі. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны, трапіўшы ў яе бязлітасны калаўрот, героі аповесці спазналі кашмар нямецкіх бамбардзіровак і абстрэлаў, горыч і нягоды акружэння і палону. У жудасных умовах Мінскага гета яны не страцілі чалавечай годнасці і волі да барацьбы, стварылі падпольную групу супраціву і здолелі вырвацца за калючы дрот, каб у партызанскіх лясах змагацца з варожаю навалай.

**УДК 821.161.1(476)–1**
**ББК 84(4Беи=Рус)–5**

**ISBN 978-985-6981-17-6**

© Баторын Ф. Б., 2011
© Герасімава І. П. Уступны артыкул, 2011
© Афармленне. Выдавецтва «Чатыры чвэрці», 2011

# Першыя старонкі летапісу антынацысцкага супраціву

«Чорны год» – так назваў я сваю мастацка-дакументальную аповесць, у аснову якой пакладзеныя ўспаміны былых вязняў Мінскага гета, а таксама тых жыхароў Беларусі, каму выпала на долю зрабіцца сведкамі страшных падзей, названых намі Халакостам. Аповесць ахоплівае перыяд з чэрвеня па снежань 1941 года і расказвае пра стварэнне адной з першых падпольных груп супраціву, якая потым перайшла ў партызаны.

З гісторыі нам вядома, што ў адказ на рэпрэсіі з боку любых заваёўнікаў і тыранаў узнікае супрацьдзеянне; таму, гаворачы пра адно, няможна прайсці міма другога. Значэнне карпатлівага навуковага даследавання і шырокага асвятлення абедзвюх гэтых тэмаў неаспрэчнае. Але калі гаворка ідзе пра глабальныя з'явы і вялікія лічбы, непазбежна ўзнікае «эфект статыстыкі», г. зн. у ценю маштабнае з'явы губляецца трагедыя канкрэтнага чалавека. Вось чаму важна, каб побач з шырока абагульняючымі працамі існавалі навуковыя, мастацка-дакументальныя і мастацкія творы, прысвечаныя прыватным падзеям і канкрэтным асобам. Побач з грунтоўнымі глабальнымі працамі яны ствараюць маральна-псіхалагічны фон, які дапамагае пераадолець «эфект статыстыкі».

Другая задача такіх твораў – разбурэнне міфаў, што ўсё яшчэ працягваюць існаваць. У адносінах да Халакосту гэта міф пра ўласную віну ахвяраў у сваёй пагібелі. Яны, маўляў, пакорліва ішлі на страту, нават не спрабуючы

ратавацца. Праўдзівы паказ жахлівых акалічнасцяў, якія не пакідалі яўрэям шанцаў на ратаванне, і людзей – далёка не адзінак! – што здолелі перамагчы гэтыя акалічнасці, разбурае памянёны міф.

Група Барыса Хаймовіча была хіба не самай першаю сярод групаў супраціву ў Мінскім гета. Людзі, якія ўваходзілі ў яе, зведалі жах бамбёжак мірнага насельніцтва германскай авіяцыяй, цудам пазбеглі расстрэлаў, што ўчынялі гітлераўцы проста на абочынах дарог, адбіраючы з гэтай мэтаю бежанцаў і акружэнцаў, якіх палічылі яўрэямі, прайшлі праз першыя масавыя пагромы ў гета. У практычна безвыходнай сітуацыі гета яны змаглі згуртавацца, сагітаваць аднадумцаў, са зброяй вырвацца за калючы дрот і ўліцца ў партызанскія шэрагі.

Дзеля ўзмацнення эмацыянальнага ўздзеяння на чытача я абраў шлях белетрызацыі свайго твора, захаваўшы строгую дакументальнасць імёнаў і падзеяў.

Абапіраючыся на такія дакументы, як успаміны відавочцаў, напісаныя праз дзесяцігоддзі пасля адлюстраваных у іх падзеяў, даводзілася рэканструяваць факты, улічваючы непазбежныя супярэчнасці і недакладнасці, што сустракаліся ў тых мемуарах. Разам з тым уражваюць фатаграфічна зафіксаваныя ў памяці гэтых людзей пранізлівыя дэталі, такія, як цвырканне конікаў у траве адразу пасля кананады альбо спеў жаўрука ў небе над часовым лагерам для ваеннапалонных...

Ідэя напісання гэтай кнігі падказана мне ў 1985 годзе навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі тагачаснай АН БССР Ганнай Паўлаўнай Купрэевай, якая ў няпросты час напярэдадні крызісу савецкай сістэмы сабрала вялікую колькасць матэрыялаў па Мінскім гета. Пэўную дапамогу аказаў ёй і я, будучы асабіста знаёмым з усімі ўдзельнікамі групы Б.Ф. Хаймовіча, майго бацькі,

і маючы магчымасць па многу разоў сустракацца з імі і запісваць іх успаміны, якія яны прачытвалі, правілі і падпісвалі сваеруч.

На вялікі жаль, аб'ёмная навуковая праца, задуманая Г.П. Купрэевай, не была створана з-за адмоўнай пазіцыі партыйных кіраўнікоў, далёкіх ад пераадолення састарэлых рэакцыйных стэрэатыпаў. Пад іх моцным уціскам Ганна Паўлаўна была змушана пакінуць працу, а сабраныя ёю матэрыялы надоўга зніклі ў архіве. Калі ж палітычная сітуацыя ў нашай краіне змянілася, гэтыя матэрыялы былі шырока выкарыстаныя шмат кім без спасылак на ініцыятарку даследавання і збіральніцу сведчанняў, якая з-за цяжкай невылечнай хваробы не змагла адстояць свае аўтарскія правы. Прапанаванай чытачу кнігай я хачу хоць крыху зменшыць гэтую несправядлівасць.

*Аўтар*

# Погляд гісторыка

Ужо мінуў не адзін дзесятак год пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, але й цяпер адкрываюцца ўсё новыя старонкі яе трагічнай і гераічнай гісторыі. Адрэзак часу, роўны чалавечаму жыццю, аддзяляе новыя пакаленні людзей ад тае пары, але розум і сэрцы людзей зусім іншай гістарычнай эпохі нязменна трывожаць несціхальныя грымоты самай крывавай вайны ў гісторыі чалавецтва.

Пасля таго як радыкальна змянілася грамадска-палітычная сітуацыя ў Беларусі, шмат якія факты былых часоў паўсталі ў іншым святле, пазбаўленыя покрыву надагаворвання і маны. Менавіта так адбылося з тэмай яўрэйскага супраціву ў цэлым і барацьбы герояў Мінскага гета ў прыватнасці. Як афіцыйныя ўлады, так і гісторыкі доўгія гады замоўчвалі альбо абыходзілі гэтую тэму. Кніга Фелікса Баторына, сына вядомага падпольшчыка з Мінскага гета Барыса Хаймовіча, напісаная чвэрць стагоддзя таму, толькі цяпер атрымала магчымасць трапіць да чытача. І хоць многія факты за гэты час зрабіліся вядомымі, гэтая кніга не страціла сваёй актуальнасці.

Асаблівасць кнігі ў тым, што аўтар слухаў і занатоўваў размовы і ўспаміны былых падпольшчыкаў і партызанаў у сваім родным доме, сцены якога былі сведкамі падзеяў, пра якія ішла гаворка. Фелікс Баторын хадзіў разам з будучымі героямі свайго аповеду па вуліцах колішняга гета, у жалобе схіляў галаву каля магіл, дзе знайшлі апошні прытулак ахвяры і героі ваеннай трагедыі. І гэтыя непа-

срэдныя стасункі аўтара з героямі яго кнігі працягваліся доўгія гады.

Многія старонкі аповесці «Чорны год» нібыта паўтараюць дакументальныя крыніцы па той прычыне, што памянёныя дакументы, якія сёння захоўваюцца ў розных архівах краіны, ствараліся гэтымі ж людзьмі. Акрамя таго, аўтар абапіраецца і на матэрыялы, сабраныя вядомай даследчыцай, супрацоўніцай інстытута гісторыі НАН Беларусі Ганнай Купрэевай.

Менавіта спалучэнне ў кнізе дакументальнага і мастацкага пачаткаў даюць магчымасць яскрава ўявіць герояўпадпольшчыкаў Мінскага гета і іх сумесную барацьбу з мінскім гарадскім падполлем супроць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Аўтару ўдалося стварыць запамінальныя вобразы канкрэтных людзей, якія дзейнічаюць у кнізе пад сваімі імёнамі, што ўзмацняе праўдзівасць паказу падзеяў.

Апублікавана вялікая колькасць навуковых артыкулаў і манаграфіяў аб гісторыі Мінскага гета. Аднак сярод іх вельмі мала публікацый і кніг, што даюць магчымасць на свае вочы ўбачыць храбрацоў жывымі людзьмі з плоці і крыві, якія, рызыкуючы не толькі ўласнымі жыццямі, але і жыццямі сваіх блізкіх, мацярок, братоў, дзяцей, без пафасу і жадання выглядаць лепшымі, чым былі на самай справе, рабілі тое, што мы сёння з поўным правам называем выкананнем свяшчэннага абавязку.

І цяпер, калі, на жаль, многія нашыя сучаснікі разгубіліся, зняверыліся альбо страцілі маральныя каштоўнасці, выхаваўчую ролю кніг, падобных да мастацка-дакументальнай аповесці Фелікса Баторына «Чорны год», цяжка пераацаніць. Неабходнасць выдання гэтай кнігі відавочная.

*І. П. Герасімава,*
*кандыдат гістарычных навук,*
*старшыня ГА «Рэспубліканскі фонд “ХАЛАКОСТ”»,*
*дырэктар Музея гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі*

# Раздзел I

## 1

Сонца было яшчэ даволі высока, але гарачыня прыкметна ачахла, саступіўшы месца мяккай прахалодзе чэрвеньскага адвячорка. Нарадзіўшыся ў густых чаратах і зарасцях аеру, якіх так шмат усцяж топкіх берагоў плыткае рэчкі Белай, лагодны ветрык прашамацеў у лістоце прыбярэжных вербаў, прабег усцяж вузкіх беластоцкіх вулачак і развеяў санлівае здранцвенне, што панавала ў цесных дварах-калодзежах і зялёных дворыках-садах рознапавярховага горада. Прываблены прахалодаю, беластачане пачалі выходзіць з дамоў. Старыя – памяркоўныя і нетаропкія, з пышнымі вусамі, з барodamі і бародкамі розных адценняў і фасонаў – сядалі на лавачкі, частуючы адзін аднаго тытунём, раскурвалі свае «файкі» і пачыналі няспешную гаворку, мяшаючы беларускія, рускія, польскія і яўрэйскія словы. Маладзейшыя, акуратна паголеныя, у адпрасаваных кашулях, шырачэзных штанах і парусінавых чаравіках, шпацыравалі са сваімі страката апранутымі кабетамі пад зялёнымі шатамі прысадаў. Тут і там на падваконніках расчыненых вокнаў з'яўляліся патэфоны, адна адну перабівалі шматлікія мелодыі, сярод якіх найчасцей можна было адрозніць «Рыа-Рыту» і «Стомленае сонца». Моладзь танцавала. Падлеткі ў саколках, якія так павыгаралі на сонцы, што вызначыць іх першапачатковы колер было вельмі няпроста, і чорных альбо сініх сацінавых шараварах гулялі ў мяч прама па-

сярод завулкаў, дзе амаль ніколі не ездзілі машыны. Дурэлі малыя.

Уздоўж вуліцы Фабрычнай паспешліва ішоў чалавек у светлым летнім касцюме напаўспартыўнага крою. Ён быў хударлявы, сярэдняга росту, вялікія залысіны ўгрызаліся ў хвалістую русую шавялюру, павялічваючы і без таго высокі лоб. Шэрыя вочы пазіралі заклапочана і стомлена. У постаці гэтага чалавека, яго зладжаных, дакладных рухах угадваліся сіла і спрыт. Яго можна бало прыняць за спартсмена, у крайнім выпадку, за настаўніка фізкультуры. Аднак ён не быў ні тым, ні другім.

У свае крыху за трыццаць год Барыс Хаймовіч меў багаты жыццёвы вопыт. У пяцігадовым узросце, замест таго, каб гуляць у алавяныя салдацікі, ён памагаў маці-салдатцы разблытваць пражу: на фабрыцы, дзе маці брала работу на дом, плацілі за гэта мізэрныя капейкі, але і яны былі дапамогаю сям'і, у якой Борка быў старэйшы з дзяцей. Бацька ваяваў на імперыялістычнай і прапаў без вестак недзе ў пятнаццатым годзе. Калі хлопчык крыху падрос, яго ўзяў у памагатыя да сябе ў кузню дзед, матчын бацька, вясковы каваль. У падарунак унуку дзед выкаваў цацачную сякерку. Сякерка была зусім як сапраўдная, востранькая і звонкая, ёю можна было калоць цурбачкі на распальванне печы. Аднойчы ў час такога занятку Борка трапіў сабе па пальцы. Баючыся, што маці будзе сварыцца ( а яна была застрэмістая на язык і цяжкая на руку ), хлопчык ціхенька закруціў палец анучкаю. Маладое цела зажыло хутка, але пазногаць зросся вуглом – такі ён і застаўся на ўсё жыццё, напамінаючы пра дзеда, якога ў дзевятнаццатым забілі бандыты.

Барысаў бацька Файвель вярнуўся з германскага палону са швейцарскім гадзіннікам у кішэні і з язваю ў страўніку. Работнік з яго быў ніякі: большасць часу

былы салдат сядзеў каля печы, прыціскаючы да жывата гарачую патэльню. Здабытчыкам у сям'і зрабіўся Борка. Ён асвоіў прафесію шаўца і ў шаснаццаць год стаў адмысловым майстрам. Праўда, давялося пасля чацвёртага класа кінуць школу, але ж ён такі быў не адзін...

Сіла і спрыт перадаліся Барысу, відаць, ад дзеда. Усё ён умеў, і на ўсё яму ставала часу. Сваімі рукамі, амаль без староннняй дапамогі, паставіў падлетак новую хату. Ён касіў траву для каровы, мыў на рэчцы пялюшкі сваім малодшым брацікам і сястрычкам, якія пасля вяртання Файвеля з палону пасыпаліся, як гарох з пераспелага стручка, пілаваў дровы. І пасля ўсяго ў хлопца знаходзіўся час на выкананне камсамольскіх даручэнняў.

У дваццаць сёмым Хоцімскі павяткам камсамола даручыў Барысу правесці ў вёсцы Сянное сход сялян і сагітаваць іх уступіць у калгас. У Сянным існавала ўжо суполка па сумеснай апрацоўцы зямлі, але павяткам лічыў гэта недастатковым. Сход прайшоў нібыта ўдала. Але калі Барыс апоўначы вяртаўся пешкі ў Хоцімск, у яго за спінаю адзін за адным бухнулі два стрэлы, і над самым вухам ціўкнула куля. З дому давялося з'ехаць.

Пасяліўшыся ў Гомелі ў прахадным пакойчыку без вокнаў у кватэры стрыечнага брата, Барыс не адчуваў няўтульнасці. Не давала яму спакойна жыць іншае: не было работы. Ледзь не праз год здолеў Барыс нарэшце ўладкавацца на абутковую фабрыку. Ён працаваў на машыне, якая прыбівала абцасы да чаравікаў. А падавальшчыцаю ў яго была хударлявая дзяўчынка з тоўстаю і доўгаю касою. Звалася дзяўчынка Соняю.

Ох і нацярпеўся Барыс ад гэтага дзіцяняці! Яна павінна была наторкваць у патрэбныя месцы цвікі, якія адным ударам заганяла ў абцас Барысава машына. Цвікі трэба было ставіць прама, інакш яны загіналіся, даводзілася іх